# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 3(53) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Палиталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

## Змест

### Гісторыя

*Самусік А.Ф.* Становішча адукацыйнай справы на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XIX ст. ........ 3

*Пілецкі В.А.* Вырашэнне актуальных праблем адукацыйна-выхаваўчага працэсу ў Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.) ........ 8

*Шаўчук І.І.* Студэнты-гуманітарыі БССР (1920–1930-я гг.): сацыяльна-дэмаграфічны агляд ........ 12

*Янкоўская Т.У.* Эвалюцыя маладзёжнага руху ў Беларусі (канец XX – пачатак XXI ст.) ........ 17

*Забаўскі М.М.* Расійскае самаўладдзе ў перыяд сацыяльных і палітычных узрушэнняў (1914–1917 гг.) ........ 20

*Пуцік У.С.* Указ аб верацярпімасці і актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці рэлігійных канфесій ў Беларусі ........ 24

*Люты А.М., Лютая А.Э.* Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.) – крыніцы па гісторыі запрыгоньвання сялян у XVI ст. ........ 28

*Кадзіра У.М.* Беларуская і ўкраінская гістарыяграфія праблемы антыфеадальнай барацьбы ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. ........ 32

*Вялікая В.А.* Ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА ў Беларусі (1945–1947 гг.) ........ 35

*Салькоў А.П.* Балгара-югаслаўскія тэрытарыяльныя супярэчнасці ў савецкай палітыцы на Балканах (1941–1945 гг.) ........ 37

*Варывончык І.В.* Палітыка кіруючых адміністрацый і тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця ЗША (канец XX – пачатак XXI ст.) ........ 42

*Субоцін А.Г.* «Удар па Прусіі». Да гісторыі імперскай экзекуцыі 20 ліпеня 1932 г. у Германіі ........ 46

### Філасофія

*Новікаў В.М.* Гістарычны выбар Беларусі ў кантэксце сучасных ідэалагічных працэсаў ........ 51

*Крыштаповіч А.А.* Адкрытае грамадства: метадалогія сацыяльнай пабудовы ........ 56

### Паліталогія

*Зенчанка В.А.* Праблемы мадэрнізацыі палітычнай сістэмы грамадства: гістарычны вопыт і сучаснасць ........ 60

*Канапацкі М.Б.* Кемалізм і праблема развіцця свецкай дзяржавы ........ 63

*Лысюк А.І.* Імідж палітычнага лідэра ў працэсах культуралагічнай ідэнтыфікацыі ........ 66

*Казырэнка Н.П.* Асаблівасці палітычнай культуры пераходнага грамадства ........ 69

*Новікава С.І.* Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве і справядлівасці: ад антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў ........ 72

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 930 «17/18»*

***У.М. Кадзіра***

# БЕЛАРУСКАЯ І ЎКРАІНСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ АНТЫФЕАДАЛЬНАЙ БАРАЦЬБЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVII ст.

Праблема ўзмацнення сацыяльна-эканамічнага прыгнёту беларускага і ўкраінскага народаў і антыфеадальнай барацьбы ў другой палове XVI – 30-х гг. XVII ст. дастаткова актыўна распрацоўвалася беларускімі і ўкраінскімі гісторыкамі.

Дваранскія і клерыкальныя гісторыкі XVIII – першай паловы XIX ст. спрабавалі злучыць у адзін прычынна-выніковы шэраг суб'ектыўныя дзеянні і мэты. Так, Н. Бантыш-Каменскі бачыў у Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. выражэнне свецкіх інтарэсаў папства, сродак дзяржаўнай палітыкі і вынік кампраміснай пазіцыі вярхоў Праваслаўнай Царквы, якія выклікалі ў сярэдніх і ніжэйшых слаях грамадства адкрытае супраціўленне [1, с. 95].

Паўстанне 1830–1831 гг. падштурхнула дваранскіх і клерыкальных гісторыкаў паставіць пытанне аб гістарычных лёсах Заходняй Русі. У 1848 г. выйшла ў свет невялікая праца «Взгляд на историю Западной Руси». Невядомы аўтар, разглядаючы гісторыю Вялікага княства Літоўскага, звёў гісторыю беларускага і ўкраінскага народаў да гісторыі Праваслаўнай Царквы і рэлігіі. Асноўная мэта Каталіцкай Царквы і Польшчы заключалася ў вырашэнні гістарычнага лёсу беларускага і ўкраінскага народаў [9, с. 17].

Н. Устралаў у працах «Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское?» і «Русская история» прывёў факты па гісторыі беларускага і ўкраінскага народаў другой паловы XVI – 30-х гг. XVII ст. Аднак, асвятляючы такія падзеі, як Люблінская і Брэсцкая уніі, паўстанне казацтва і інш., аўтар, імкнучыся апраўдаць адмоўную палітыку царскага ўрада ў Беларусі і Украіне, заяўляў, што гэтыя землі заўсёды былі рускімі [18, с. 18].

О.У. Турчыновіч рэзка адмоўна адносіцца да народных рухаў і ідэалізуе палітыку вялікіх князёў літоўскіх. Да тлумачэння прычын і характару антыфеадальнай барацьбы беларускага і ўкраінскага народаў ён падышоў з клерыкальных пазіцый. Яе антыфеадальны характар заставаўся па-за ўвагай аўтара. Аднак у гэтай працы прыведзены факты, у якіх вельмі падрабязна апісваецца антыфеадальная барацьба беларускага і ўкраінскага народаў. У гэтым выразна прасочваецца пазіцыя дваранскага гісторыка, які замоўчваў сацыяльна-эканамічныя прычыны народнай барацьбы. Пры апісанні, напрыклад, паўстання віцебскіх гараджан супраць Ісафата Кунцэвіча ў 1623 г. ён даў феадальную ацэнку гэтых падзей, адзначаючы, што «ярость толпы, исступление черни, своеволие и бунт» прывялі да заслужанага пакарання [17, с. 205].

Падмена антыфеадальнай барацьбы і яе сацыяльна-эканамічных праблем толькі знешнім уплывам і рэлігійным прыгнётам вызначалася саперніцтвам за беларускія і ўкраінскія землі паміж Польшчай і Расіяй і ўтойвала сапраўдныя прычыны антыфеадальнай барацьбы беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – 30-х гг. XVII ст.

З 1882 г. пачаў выдавацца часопіс «Киевская старина», дзе былі апублікаваны артыкулы і па даследуемай аўтарам тэме. Так, у 1884 г. быў апублікаваны артыкул Ф. Мікалайчыка «Первые казацкие движения в Речи Посполитой (1591–1596): Лобода и Наливайко» [12, с. 423].

Ідэалістычныя, метафізічныя і нацыяналістычныя погляды характэрны для Н. Кастамарава, які шмат увагі аддаваў гісторыі Украіны. Ён лічыў, што нацыянальнымі якасцямі ўкраінскага народа з'яўляюцца свабодалюбства і анархізм, якія ў XVI–XVII стст. выразіліся ў дзеяннях казацтва, якое змагалася супраць адзінаўладдзя і цэнтралізацыі за адраджэнне федэратыўных пачаткаў. Спачуваючы казацтву, ён не змог даць правільнага тлумачэння яго сацыяльнай барацьбе, а таксама зразумець сацыяльны змест і прагрэсіўнае значэнне сялянскай барацьбы супраць прыгонніцтва.

М. Доўнар-Запольскі, разглядаючы гістарычнае мінулае беларускіх і ўкраінскіх зямель у канцы XVI ст., адзначае рэлігійныя праследаванні і прыгнёт, выкліканыя палітычным уплывам у Вялікім княстве Літоўскім польскіх феадалаў. Вынікам такой палітыкі з'явілася барацьба беларусаў і ўкраінцаў за яднанне і пошук апоры «в единоверной и родственной Москве» [6, с. 333].

Працы па гісторыі Украіны, Беларусі і Літвы склалі зборнік В. Антановіча «Монографии по истории Западной и Юго-Западной России», у якіх аўтар надае значную ўвагу падзеям, звязаным з барацьбой украінскага і беларускага народаў за нацыянальную незалежнасць.

У пачатку XX ст. адзін з лідэраў украінскага нацыянальнага руху М. Грушэўскі ў працы «Очерк истории украинского народа» прапаноўваў вывучаць асобна гісторыю кожнай з усход-

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

неславянскай народнасці. У сваіх працах гісторыю Беларусі ён закранаў у параўнальным аспекце [18, с. 160].

Ліберальна-народніцкія напрамкі ва ўкраінскай гістарыяграфіі раскрыты ў працах А. Яфіменка.

Працы А. Яфіменка адносяцца галоўным чынам да гісторыі сялянскага землеўладання і землекарыстання. Аўтар ідэалізавала казацкую вольнасць на Украіне ў XVI–XVII стст. Яе працы утрымліваюць фактычны матэрыял па гісторыі барацьбы ўкраінскага сялянства супраць прыгоннага права [3, с. 64].

Шмат увагі пытанням узмацнення феадальнага прыгнёту і росту барацьбы сялянства Украіны і Беларусі аддае ў сваёй працы і В. Пічэта. У другім, дапоўненым выданні гэтай працы (1940 г.), прасочваецца імкненне аўтара знайсці ў развіцці феадальнага маёнтка асноўную прычыну ўзмацнення працэсу запрыгоньвання сялянства і ўзмацнення феадальнай эксплуатацыі. Зыходзячы з тэорыі гандлёвага капіталу, распрацаванай М. Пакроўскім, В. Пічэта прычынай сацыяльных супярэчнасцей у гарадах Беларусі і Украіны лічыў рост абаротаў унутранага і знешняга гандлю [14, с. 41]. У гэтым выданні кнігі грунтоўна асветлены факты антыфеадальнай і вызваленчай барацьбы ўкраінскага і беларускага народаў, якім раней В. Пічэта не надаваў увагі.

Палітычны характар насіла манаграфія І. Лочмеля «Очерк истории» барацьбы беларускага народа супраць польскіх паноў, выдадзеная ў 1940 г. Слабая база крыніц, папулісцкая рыторыка не дазволілі аўтару даць аб'ектыўную ацэнку паўстання пад кіраўніцтвам С. Налівайкі [11, с. 24]. Правільна адзначаючы, што беларусы змагаліся супраць магнатаў і шляхты сумесна з украінцамі, ён падмяняе антыфеадальную барацьбу барацьбой антыпольскай, не ўлічвае, што сяляне і гараджане выступалі і супраць беларускіх і ўкраінскіх феадалаў.

У пасляваенны перыяд адным з вядучых даследчыкаў гісторыі аграрных адносін і сялянства ВКЛ быў савецкі ўкраінскі гісторык Д. Пахілевіч. Свае шматлікія артыкулы ён сістэматызаваў і абагульніў у манаграфіі «Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVII вв.». Аўтар адзначае пастаяннае памяншэнне зямельных надзелаў сялян, аднак не звязвае гэту з'яву з развіццём фальваркова-паншчыннай гаспадаркі. На прыкладах Кобрынскай эканоміі, Чэраванічскага і Вешыцкага двароў у другой палове XVI – першай палове XVII ст. Д. Пахілевіч даследаваў памер павіннасцей эксплуатацыі [16, с. 37]. Апошняя глава прысвечана барацьбе сялян супраць феадальнага прыгнёту пасля аграрнай рэформы 1557 г. Аўтар зрабіў вывад аб няўхільным нарастанні сялянскага пратэсту, разгледзеў розныя формы барацьбы сялян. Ён лічыў яе вышэйшай праявай сялянскую вайну сярэдзіны XVII ст. [16, с. 108].

Д. Пахілевіч зрабіў таксама спробу разабрацца ў заблытаным палітычным становішчы Беларусі першай паловы XVII ст. Асобую ўвагу ён надаваў паказу вызваленчай барацьбы беларускага сялянства. Даследчык прасачыў змяненне прававога становішча сялян ВКЛ у XVI ст.

Глыбокі аналіз статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. дазволіў І. Юхо зрабіць вывад, што ў гэтых юрыдычных актах былі афармлены рост феадальнай уласнасці, узмацненне прыгону і запрыгоньвання сялянства ў XVI ст. [19].

Сацыяльна-эканамічным перадумовам вызваленчай барацьбы сярэдзіны XVII ст. ва Украіне прысвяціў свае даследаванне А. Барановіч [2], становішчу ўкраінскага сялянства ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. – І. Бойка [3], гісторыі запарожскага казацтва – В. Галабуцкі [4].

На аснове велізарнага фундаментальнага матэрыялу, сабранага ў архівах Масквы, Мінска, Гродна, Варшавы, Львова, былі даследаваны пытанні гаспадарчага развіцця гарадоў Беларусі, сацыяльна-палітычнай і нацыянальна-рэлігійнай барацьбы гарадскога насельніцтва ў даследуемы перыяд.

З. Капыскі лічыў, што адной з асноўных крыніц папаўнення насельніцтва гарадоў з XVI ст. стала перасяленне вольных сялян, а таксама ўцёкі сялян ад сваіх уладальнікаў у сувязі з распаўсюджаннем фальваркова-паншчыннай гаспадаркі. У выніку росту феадальнай зямельнай уласнасці праглядаецца імкненне феадалаў ператварыць эканамічную дзейнасць гарадоў у крыніцу свайго даходу. На думку аўтара, была вельмі небяспечнай для гарадской абшчыны падатковая раз'яднанасць – горад абкладаўся дзяржаўнымі паборамі, якімі не абкладалася насельніцтва (былыя сяляне), якое знаходзілася пад прыватнай юрысдыкцыяй. Гэта прыводзіла да таго, што частка гараджан пераходзіла пад юрысдыкцыю буйных феадалаў Беларусі, што абвастрала барацьбу паміж апошнімі і гарадскімі ўладамі. З. Капыскі даследаваў таксама пытанне маёмаснай няроўнасці сярод гараджан [8].

Спецыфіку развіцця прыватнаўласніцкіх гарадоў у Беларусі разгледзеў А.П. Грыцкевіч [5]. Мясцовая адміністрацыя прызначалася магнатамі з ліку іх давераных асоб-намеснікаў, губернатараў, эканомаў, камендантаў крэпасцей, суддзяў, казначэяў і г. д. Орган гарадскога самакіравання (магістрат) прызначаўся гаспадаром гора-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

да. Іншымі словамі, феадальная эксплуатацыя і прыгнёт мелі месца ў многіх гарадах Беларусі. Феадальная зямельная ўласнасць і неабмежаваная ўлада магнатаў у прыватнаўласніцкіх гарадах прыводзілі да сацыяльных канфліктаў і антыфеадальнай барацьбы гараджан Беларусі.

З.Ю. Капыскі і А.П. Грыцкевіч даказалі, што для беларускага феадальнага горада было характэрна спалучэнне магдэбургскага права з нормамі гарадскога права, якое склалася ў мінулыя стагоддзі ў старажытнарускіх гарадах. Гарадскія рухі, на думку аўтараў, былі выкліканы феадальнымі ўмовамі, насілі лакальны характар і не мелі на мэце хоць якія-небудзь радыкальныя палітычныя пераўтварэнні. У кнігах дадзеных даследчыкаў паказаны розныя формы барацьбы гараджан: ад скаргаў да ўдзелу ў нацыянальна-вызваленчым руху.

У гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI ст. па-ранейшаму шмат увагі надаецца праблеме ўзмацнення феадальнага прыгнёту і антыфеадальнай барацьбы ў Беларусі і Украіне ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст.

У 90-я гг. XX ст. з'яўляецца шэраг даследаванняў, якія на аснове раней невядомых крыніц асвятляюць некаторыя пытанні дадзенай праблемы. Першае комплекснае даследаванне феадальнай рэнты ў прыватных уладаннях Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст. правёў П. Лойка, які даў падрабязную характарыстыку павіннасцей, паказаў рост эксплуатацыі сялян у магнацкіх вотчынах і маёнтках дробнай і сярэдняй шляхты [7].

Неабходна адзначыць калектыўную працу ў двух тамах, створаную супрацоўнікамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны і Навукова-даследчага інстытута казацтва, выдадзеную ў 2006 г. і прысвечаную гісторыі казацтва. Аўтары першага тома разгледзелі і прааналізавалі гісторыю ўкраінскага казацтва ад зараджэння да канца XVIII ст. Варта адзначыць гісторыка-крытычную працу С. Плохія, вядомага гісторыка-ўкраініста, прафесара Альберцінскага універсітэта Канады [15]. Асаблівую ўвагу аўтар надаваў удзелу казацтва ў рэлігійнай барацьбе канца XVI – першай паловы XVII ст. Ён лічыў і антыфеадальную барацьбу рэлігійнай.

Такім чынам, у XVI – першай трэці XVII ст. адбываюцца працэсы стабілізацыі казацтва, фарміравання яго ідэалагічнай арыентацыі. Іх вынік – гэта ўдзел казакаў і сялян у барацьбе, якая адбывалася ва Украіне і Беларусі.

Літаратура і крыніцы

1. *Бантыш-Каменский, Н.Н.* Историческое известие о возникшей в Польше унии / Н.Н. Бантыш-Каменский. – М., 1805. – С. 512.
2. *Баранович, А.И.* Украина накануне освободительной войны середины XVII века (социально-экономические предпосылки войны) / А.И. Баранович. – М.: Издательство Академии наук СССР, 1959. – С. 208.
3. *Бойко, І.Д.* Селянство України в другій половині XVII ст. / І.Д. Бойко. – Київ: Вища школа, 1963.
4. *Голобуцкий, В.А.* Запорожское казачество / В.А. Голобуцкий. – Киев: Высш. шк., 1957. – С. 538.
5. *Грицкевич, А.П.* Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.) / А.П. Грицкевич. – Минск: Наука и техника, 1979. – С. 150.
6. *Довнар-Запольский, М.В.* Белорусское прошлое: Исследования и статьи / М.В. Довнар-Запольский. – М., 1909. – Т. 1.
7. *Ефименко, А.Я.* История украинского народа / А.Я. Ефименко. – СПб., 1906. – Вып. 1.
8. *Копысский, З.Ю.* Экономическое развитие городов Беларуси в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. – Минск: Наука и техника, 1996. – С. 227.
9. *Копысский, З.Ю., Чепко, В.В.* Историография БССР (эпоха феодолизма) / З.Ю. Копысский, В.В. Чепко. – Минск: «Университетское», 1986. – С. 175.
10. *Лойка, П.А.* Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII ст. / П.А. Лойка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – С. 112.
11. *Лочмель, И.Ф.* Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И.Ф. Лочмель. – М.: Воениздат, 1940. – С. 163.
12. *Николайчик, Ф.* Первые казацкие движения в Речи Посполитой (1591–1596): Лобода и Наливайко / Ф. Николайчик // Киевская старина. – 1884. – Март. – С. 423–442.
13. *Пичета, В.И.* Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии / В.И. Пичета. – М.: Московский рабочий, 1940.
14. *Плохій, Сергій.* Наливайкова віра: Козацтво та релігія в ранньомодерній Україні / С. Плохій. – Київ: Критика, 2005. – С. 496.
15. *Похилевич, Д.Л.* Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVIII вв. / Д.Л. Похилевич. – Львов: Изд-во Львовского университета, 1957.
16. *Турчинович, О.В.* Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / О.В. Турчинович. – СПб., 1857.
17. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: «Беларуская энцыклапедыя», 1996. – Т. 3. – С. 523.

Summary

*In his work the author focuses on a problem of increasing of social and economic oppression of the Belarusian and Ukrainian people and antifeudal struggle in the second half of the XVI$^{th}$ – the 30$^{ies}$ of the XVII$^{th}$ centuries and various estimations of this problem in the historical literature.*

*The analysis of the Belarusian and Ukrainian historiography of antifeudal struggle in the second half of the XVI$^{th}$ – first thirds of the XVII$^{th}$ centuries is made by the author in a convincing, full and objective way.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ